# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 3 ліпень 2013

«Народны рэферэндум» у Гомелі – с. 2

Народ пазбаўляецца апатыі – с. 3

Карупцыя ў галіне аховы помнікаў – с. 5

Ці размарозяцца стасункі Беларусь-ЕС? – с. 6

Беларусы супраць расійскай авіябазы – с. 7

# Плошча на выбарчым участку

**Ініцыятыва «Народны рэферэндум» пакрысе пашырае геаграфію. І на палітычным полі, і на электаральным.**



Да Руху «За Свабоду», кампаніі «Гавары праўду» і Партыі БНФ далучылася Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада). Ідуць перамовы з шэрагам іншых палітычных сіл.

Кансалідацыя падвышае шанцы на поспех. Калі, натуральна, кансалідацыя – спосаб, а не шыльдавая самамэта.

Але самае галоўнае – мы, як і абяцалі, пайшлі ў народ. Белаазёрск, Брэст, Слуцк, Магілёў, Смаргонь, Гомель, Рэчыца, Орша, Віцебск… Гэта толькі пачатак.

Напаўняем пытаннямі ад народа парадак дня рэферэндума. Акрэсліваем хвалюючыя праблемы. Занатоўваем прапановы.

Збольшага слухаем, а не гаворым! Ды знаходзім агульную мову.

Але народ хоча не проста выказацца, хаця нават гэта права ў яго адабралі. Людзі хочуць, каб іхняя пазіцыя, слова, волевыяўленне нешта значылі.

Разам з тым рэферэндум як інструмент ажыццяўлення переменаў бесперспектыўны без грамадскай падтрымкі на карысць альтэрнатывы.

Адмысловая крытычная маса падтрымкі – перадумова таго, што рэферэндум пройдзе не па-ярмошынску: то бок, пад народным кантролем за выбарчымі камісіямі, з празрыстым падлікам галасоў.

Значную ролю ў такім выпадку можа выканаць кампанія назірання «За справядлівыя выбары», ініцыяваная Рухам «За Свабоду» яшчэ ў 2008 годзе. Кампанія ладзілася высілкамі многіх грамадскіх і палітычных сілаў цягам ужо некалькіх выбараў.

Мэтай кампаніі назірання было змяніць стаўленне грамадства да таго, што вырабляе з выбарамі ўлада, і мабілізаваць неабыякавых у справе абароны сваіх выбарчых правоў.

Але, па сутнасці, кампанія назірання дагэтуль зводзілася да простай фіксацыі фальсіфікацый і парушэнняў. У межах жа ініцыятывы «Народны рэферэндум» яна можа быць зарыентавана на грамадска-палітычны вынік – адкрытую, актыўную падтрымку пераменаў, якія будуць зрэалізаваны праз народнае волевыяўленне.

Гэтак будзе, калі своеасаблівая Плошча паўстане на кожным выбарчым участку.

**Юрась ГУБАРЭВІЧ**

# Народ пра рэферэндум

**Паводле дадзеных Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, ідэю правядзення рэферэндуму для карэкціроўкі курсу развіцця Беларусі падтрымлівае большасць грамадзян краіны, у тым ліку і амаль палова прыхільнікаў кіраўніка дзяржавы.**

Найбольш папулярная ідэя «Народнага рэферэндума», паводле вынікаў чэрвеньскага апытання НІСЭПД, ва ўзроставай групе 40-50 гадоў – 62.3%, у найменшай ступені сярод тых, каму 60 і больш гадоў – 40.5%. На стаўленне да рэферэндуму істотна ўплывае ўзровень адукацыі: розніца паміж беларусамі з пачатковым і вышэйшай адукацыяй амаль двухразовая – 34.4% vs.63.6%.

Прадэкларавалі сваю гатоўнасць паставіць подпіс у падтрымку правядзення рэферэндуму 57.5% рэспандэнтаў (49.6% прыхільнікаў і 67.3% праціўнікаў А. Лукашэнкі).

**Працяг на с. 4**









ODSGOMEL.ORG

# «Народны рэферэндум» у Гомелі

**Ініцыятары «Народнага рэферэндуму» правялі ў ліпені шэраг сустрэч і мерапрыемстваў у тым ліку на Гомельшчыне.**

Сюды прыехалі **Аляксандр Мілінкевіч** ад Руху «За Свабоду», **Андрэй Дзмітрыеў** з «Гавары праўду» і **Аляксей Янукевіч** ад Партыі БНФ, каб даведацца найбольш хвалюючыя праблемы гамяльчан і жыхароў вобласці, пішуць «Моцныя навіны».

Асобная ўвага была звернутая на прадпрымальнікаў. Прадстаўнікі малога бізнесу ў апошні час усё часцей трапляюць ў фокус СМІ – не так даўно скончыўся страйк з нагоды ўвядзення сертыфікатаў Мытнага саюзу. Так, Мілінкевіч, Дзмітрыеў і Янукевіч наведалі ў Гомелі ГЦ «Сакрэт» і рынак «Цэнтральны» для таго, каб абмеркаваць з прыватнікамі асаблівасці бізнесу ў Беларусі. Варта адзначыць, што, нягледзячы на складанасці, большасць людзей маюць намер змагацца за свае правы і таму пазітыўна ўспрынялі ідэю «Народнага рэферэндуму».

На прэс-канферэнцыі ініцыятары кампаніі распавялі пра мэты сваёй працы. Па словах Аляксандра Мілінкевіча, рэферэндум павінен аб'яднаць беларусаў, вылучыць пяць-сем асноўных, найбольш вострых для краіны праблем, якія патрабуюць рэформаў. За вынясенне гэтых пытанняў на рэферэндум прадстаўнікі дэмакратычных сіл разлічваюць сабраць ад 500 тысяч да мільёна подпісаў. Андрэй Дзмітрыеў выказаў упэўненасць у тым, што як толькі кампанія пачне працаваць у поўную сілу, да яе абавязкова далучацца прадстаўнікі іншых сіл і рухаў.



Пасля сустрэчы з прадпрымальнікамі і прэс-канферэнцыі Мілінкевіч, Дзмітрыеў і Янукевіч наведалі месца, дзе ў часы сталінскіх рэпрэсій адбываліся масавыя расстрэлы, і ўсклалі кветкі да паклоннага крыжа, усталяванага мясцовымі актывістамі.

Таксама арганізатары «Народнага рэферэндуму» прыбылі на сустрэчу з актывістамі гомельскага грамадзянскай супольнасці, каб распавесці аб планах і параіцца з нагоды правядзення кампаніі.

Акрамя словаў падтрымкі, некаторыя выступілі супраць ідэі «Народнага рэферэндуму», заявіўшы, што ўлада



зможа фальсіфікаваць вынікі кампаніі. Андрэй Дзмітрыеў, у сваю чаргу, выказаў меркаванне аб тым, што ў Беларусі недаацэньваюць крытычную масу незадаволеных людзей. *«Калі ў нас атрымаецца рэферэндум, мы будзем назіраць велізарныя ўсплёск сацыяльнай актыўнасці. Гэта будзе зусім новы ўзровень вырашэння праблемаў».*

# Беларусы пазбаўляюцца апатыі

**Такую выснову зрабілі ініцыятары «Народнага рэферэндуму», аб'ехаўшы тузін гарадоў і мястэчак.**

Віцебск стаў 13-м горадам, дзе намеснік кіраўніка руху «За Свабоду» **Юрась Губарэвіч** і намеснік старшыні грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» **Андрэй Дзмітрыеў** сустракаліся з мясцовымі чыноўнікамі, прадпрымальнікамі, журналістамі і звычайнымі мінакамі на вуліцы.

Падчас візіту актывісту дэмакратычных арганізацый наведалі «Віцебскі гарадскі цэнтр часовага (начнога) знаходжання для асобаў без вызначанага месца жыхарства» і перадалі дырэктару ўстановы сабраныя рэчы і прадукты.

Па словах Андрэя Дзмітрыева, падарожжы па розных гарадах – гэта галоўны этап у падрыхтоўцы «Народнага рэферэндуму», які дазволць сфармуляваць 4-5 пытанняў, найбольш актуальных для ўсіх жыхароў Беларусі. Да канца жніўня ініцыятары кампаніі плануюць аб'ехаць 30 населеных пунктаў, і візіт у Віцебск надарыўся якраз тады, калі амаль палова «падарожнага плану» ужо была выканана. Таму на прэсавай канферэнцыі Дзмітрыеў і Губарэвіч агучылі прамежкавыя вынікі.

Галоўная выснова – гэта тое, што беларусы паступова пазбаўляюцца апатыі, лічыць Юрась Губарэвіч:

«У людзей вельмі шмат пытанняў. *Часта яны тычацца нейкага агульнага аспекту, але закранаюць розныя ракурсы праблемы. Прыкладам, пытанні экалогіі гучалі і ў Белазёрску, і ў Смаргоні, але людзі гаварылі не толькі пра захаванасць прыроднага асяродку. Яны акцэнтавалі ўвагу на тым, што ўлады даюць дазвол на пабудову прадпрыемстваў, якія нясуць шкоду навакольнаму асяроддзю і здароўю мясцовых жыхароў, аднак іхныя меркаванні не ўлічваюцца. І верагодна, адным з пытанняў «Народнага рэферэндуму» магло б стацца такое: каб насельнікі той ці іншай тэрыторыі былі надзеленыя правам даваць дазвол на будаўніцтва ці наадварот не дазваляць будаваць у іх патэнцыйна шкодныя прадпрыемствы».*

Вельмі істотна, што людзі не замоўчваюць сваіх праблемаў. Гэта новая тэндэнцыя ў беларускім грамадстве: да 2011 году, калі ўлады адчувалі сябе ўстойліва і маглі гарантаваць людзям хаця б стабільныя заробкі, прыслухоўвацца да меркаванняў апазіцыі шмат хто проста не лічыў патрэбным. Пасля крызісу з'явілася вялікая колькасць тых, хто расчараваўся ў метадах і сродках кіравання вышэйшай улады. І яны пачалі задумвацца пра альтэрнатыўныя шляхі развіцця краіны.

*Акрэсленыя жыхарамі Беларусі пытанні і праблемы мяркуецца выкарыстаць падчас бліжэйшых выбараў у мясцовыя саветы*

На думку Андрэя Дзмітрыева, цяпер стала выразным і відавочным абурэнне беларусаў тым, што ўлады да іх не прыслухоўваюцца:

*«Адсутнасць павагі – яна ва ўсім. Гэта і зняважлівае стаўленне непасрэднага начальства, і тое, што ўладу на месцах не абіраюць, а прызначаюць. Прызначаны чалавек не будзе дбаць пра развіццё свайго горада і раёна – ён будзе заклапочаны толькі тым, каб спадабацца тым, хто яго прызначыў «зверху»… А нашы людзі стаміліся ад непавагі...»*

Ініцыятары «Народнага рэферэндуму абяцаюць, што будуць прааналізаваныя ўсе пытанні, якія давялося пачуць. Прыкладам, у Рагачове да іх звярнуліся з прапановай, каб заканадаўчым чынам зацьвердзіць нейкую «верхнюю планку» крэдытаў, якія мае права ўзяць урад. Бо аддаваць знешнія пазыкі давядзецца ўжо нашым дзецям і ўнукам…

Акрэсленыя жыхарамі Беларусі пытанні і праблемы мяркуецца выкарыстаць падчас бліжэйшых выбараў у мясцовыя саветы, удакладняе Дзмітрыеў:

*«З мясцовымі выбарамі сувязь будзе наступная: у верасні мы вызначымся з пытаннямі на рэферэндум, і прапануем незалежным кандыдатам прапрацаваць гэтыя праблемы ў сваіх перадвыбарчых праграмах. Нам важна выкарыстаць выбары каб казаць людзям пра тое, што патрэбны «Народны рэферэндум», што ёсць гэтыя 5 пытанняў. Каб пасля выбараў не засталося ніводнага чалавека, які не ведае пра «Народны рэферэндум» ці не разумее, што гэта такое. Пасля пачнецца збор подпісаў за правядзенне рэферэндума, трэба будзе сабраць 450 тысяч подпісаў».*

Застаўся адзін месяц часу, вызначаны для паездак па рэгіёнах, для сустрэч і размоваў з людзьмі. Ініцыятары «Народнага рэферэндуму» просяць акрэсліць найбольш вострыя праблемы і ўсіх тых, да каго яны «не даедуць», піша «Салідарнасць».

Андрэй Дзмітрыеў і Юрась Губарэвіч прапануюць звязвацца з імі асабіста і праз адмысловыя групы, створаныя ў сацыяльных сетках. У верасні, верагодна, пачне працу і адмысловы інтэрнэт-сайт, прысвечаны «Народнаму рэферэндуму».

# Народ пра рэферэндум (працяг)

Пачатак на с.1

Адмовіліся падпісваца за рэферэндум – 32.7%, не змаглі адказаць – 9.8%.

Пагадзіліся ўвайсці ў ініцыятыўную групу і дапамагчы сабраць подпісы ў падтрымку рэферэндуму 22% (што эквівалентна 1,5 мільёна беларускіх выбаршчыкаў). Прычым, што варта прызнаць нечаканым, палітычныя перавагі рэспандэнтаў практычна не паўплывалі на іх гатоўнасць збіраць подпісы (20.8% прыхільнікаў і 23.3% праціўнікаў А. Лукашэнка). Не пагадзіліся – 68.3%, не змаглі адказаць – 9.7%.

Верацьу магчымасць рэферэндуму паўплываць на паляпшэнне сітуацыі ў краіне каля паловы беларусаў. Прынцыповых адрозненняў ў поглядах прыхільнікаў і праціўнікаў Лукашэнкі няма. Узрост рэспандэнтаў таксама не ўплывае на ўзровень іх аптымізму/песімізму. Што тычыцца адукацыі, то ўзровень аптымізму рэспандэнтаў з універсітэцкімі дыпломамі апынуўся прыкметна вышэй, чым з пачатковай адукацыяй – 57.7% vs. 28%.

*«Сумняваца ў тым, што пры любой спробе апазіцыйных партый і рухаў ініцыяваць правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму, улады паступяць «як звычайна», не прыходзіцца. Але дадзеныя сацапытання паказваюць – ідэя рэферэндуму аб будучыні развіцці Беларусі папулярная ў грамадстве. Такую папулярнасць можна разглядаць у якасці індыкатара масавай незадаволенасці беларусаў сацыяльна-эканамічнай палітыкай, якая праводзіцца ўладамі ў рамках так званай «беларускай мадэлі развіцця», а таксама патраплення гэтай ідэі ў фокус грамадскіх чаканняў»,* – кажуць сацыёлагі.



*Прадэкларавалі сваю гатоўнасць паставіць подпіс у падтрымку правядзення рэферэндуму 57.5% рэспандэнтаў*

Якія самыя важныя пытанні, на думку апытаных, павінны былі б выносіцца на ўсенародны рэферэндум? (Магчыма было падаць больш за адзін адказ).

| | |
|---|---|
| ***Эканамічныя рэформы*** | ***51.6%*** |
| ***Медыцынская рэформа*** | ***45.7%*** |
| ***Адукацыйная рэформа*** | ***36.0%*** |
| ***Пенсійная рэформа*** | ***32.5%*** |
| ***Абавязковае ўзгадненне з грамадзянамі праз правядзенне рэферэндуму праектаў, сур'ёзна ўплываючых на ўмовы жыцця (напрыклад, будаўніцтва атамнай электрастанцыі, прыватызацыя найбуйнейшых прадпрыемстваў Беларусі)*** | ***29.6%*** |
| ***Паляпшэнне адносін з Еўрапейскім Саюзам*** | ***24.6%*** |
| ***Адстаўка прэзідэнта і ўрада*** | ***20.4%*** |
| ***Абарона правоў працоўных калектываў і калектываў уласнікаў*** | ***17.0%*** |
| ***Грамадскі кантроль над дзейнасцю праваахоўных органаў і судоў*** | ***16.5%*** |
| ***Інтэграцыя з Расійскай Федэрацыяй*** | ***13.8%*** |
| ***Прамыя выбары кіраўнікоў гарадоў (мэраў) і рэгіёнаў (губернатараў)*** | ***11.6%*** |
| ***Незалежнасць судоў*** | ***11.3%*** |
| ***Статус дзяржаўных моў*** | ***4.8%*** |

# Каментар не надрукавалі

**Журналістка газеты «Мінскі кур'ер» рыхтавала артыкул пра новы закон аб рэкламе і папрасіла актывістку Руху «За Свабоду», юрыстку Дар'ю Каткоўскую выступіць у якасці эксперта. Тая пагадзілася, але з умовай: яе інтэрв'ю будзе надрукавана на беларускай мове.**

Праз пэўны час журналістка даслала Дар'і тэкст – цалкам рускамоўны.

Каткоўская напісала ліст: чаму артыкул рускамоўны, пра беларускую мову я прасіла ў пачатку інтэрв'ю.

*«Журналістка адказвае, што за такі кароткі тэрмін не зможа перакласці тэкст на беларускую (матэрыялу там – адна старонка А4), бо па-беларуску не піша і «для (яе) гэта пэўная складанасць»,* – апавядае Каткоўская і тлумачыць. – *Я лічыла, што для журналіста дзяржаўнага выдання веданне абедзвюх дзяржаўных моваў абавязковае»*

Каткоўскай патэлефанаваў намеснік рэдактара «Мінскага кур'ера» **Міхаіл Міхайлаў** і сказаў, што (Дар'я цытуе) *«Публікацыя цэлай паласы на беларускай мове паломіць усё аблічча нашай газеты».*

# Антон Астаповіч: Прагін на карысць інвестараў – карупцыя

**Складваецца вельмі небяспечная сітуацыя з нашымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі (ГКК), заяўляе старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, рухавец Антон Астаповіч.**

Паводле яго слоў, Саветам міністраў Беларусі падрыхтавана даручэнне ад 23 сакавіка 2013 года № 05/206-88 аб неабходнасці аналізу існуючага Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў і ўнясення прапаноў па яго скарачэнні. Ініцыятыва падтрымана іншымі дзяржаўнымі органамі краіны, найперш кіраўніцтвам Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, пра што сведчыць шэраг заяў старшыні гэтага ведамства Аляксандра Якабсона.

*«Ёсць некалькі аб`ектаў, якія ўключаны ў дзяржаўны спіс неабгрунтавана,* – прызнаў Астаповіч. – *Напрыклад, Свята-Елісавецінскі манастыр, які знаходзіцца ў мінскім мікрараёне Навінкі. Гэта новыя пабудовы, якія не падыходзяць ні пад адны крытэрыі, вызначаныя заканадаўствам. Тое ж можна сказаць пра Брэсцкі праваслаўны сабор, які ўнесены у дзяржспіс як нематэрыяльная каштоўнасць».*


BUDZMA.ORG

*Ёсць афіцыйныя звесткі аб выключэнні са спіса гісторыка-культурных каштоўнасцяў аж 15 (!) аб`ектаў Бабруйскай крэпасці*

Астаповіч бачыць небяспеку ў тым, што даручэнне ўрада ўспрынята як скарачэнне спіса за кошт найперш аб`ектаў гісторыі і архітэктуры. Ужо ёсць інфармацыя з месцаў, якая пацвярджае гэта.

Так, паводле слоў старшыні таварыства аховы помнікаў, Брэсцкім гарвыканкамам падрыхтаваны дакументы аб пазбаўленні статусу ГКК будынка па вуліцы Астроўскага, 10, у гістарычным цэнтры горада, які толькі ў 2010 годзе ўнесены ў дзяржаўны спіс. Падстава – «у сувязі з тым, што ён перашкаджае рэалізацыі інвестыцыйнай дамовы», паведамляе БелаПАН.

Ёсць таксама афіцыйныя звесткі з Бабруйска аб выключэнні са спіса аж 15 (з 49) аб`ектаў Бабруйскай крэпасці.

Як адзначыў Антон Астаповіч, амаль усе прапановы па наданні статусу помнікаў гісторыі і культуры аб'ектам матэрыяльнай спадчыны, якія паступілі за апошні перыяд ад імя грамадскіх аб'яднанняў і ініцыятыў, беспадстаўна блакіруюцца Міністэрствам культуры ці атрымліваюць неабгрунтаваныя адмоўныя вынікі разгляду на пасяджэннях Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Мінкультуры.

*«Мы гэта расцэньваем як спробу канчаткова скараціць дзяржаўны спіс і праводзіць усе работы на ГКК з мінімальным удзелам грамадскага кантролю, – заяўляе Астаповіч. – Статус ГКК хоць і не спыняе інвестараў, але робіць для іх пэўныя перашкоды. Не першы год кажу: калі ў нас заканадаўства прагінаецца на карысць інвестараў – гэта карупцыя. Ёсць помнікі – ёсць праблемы, няма помнікаў – няма праблемы. Скарачэнне спіса – гэта для чынавенства шлях да спрашчэння свайго*

# праз беларускую мову

Ён заявіў, адзначае «Наша ніва», гэта нягледзячы на тое, што ў артыкуле № 17 Канстытуцыі замацавана раўнапраўе 2-х дзяржаўных моваў.

*«У пасведчанні аб рэгістрацыі «МК» указаная адна мова: руская, – каментуе сітуацыю намеснік рэдактара Міхаіл Міхайлаў. – У нас рускамоўны чытач, і абіраць, на якой мове друкаваць той ці іншы матэрыял – нашае права. Пажаданні аўтараў наконт мовы ўлічваюцца, калі б газета на падставе дамовы замовіла які-небудзь матэрыял. Тут сітуацыя іншая: мы звярнуліся да яе як да эксперта».*

*«Змагары за беларускую мову часта выкарыстоўваюць яе як нейкую фронду, і ствараюць гэтым дурную рэпутацыю як мове, так і сабе. Я – чалавек, які размаўляе па-руску, і чытаў у арыгіналах і Караткевіча, і Коласа, і Купалу, беларускую мову паважаю і разумею. Але калі размова ідзе пра закон аб рэкламе – тэма дастаткова спецыфічная – чаму мы павінныя змяняць сваю канцэпцыю?»*

Спрэчны матэрыял у друк так і не выйшаў і «ўсё аблічча газеты» не паламаў.

Газету «Мінскі кур'ер» выдае гарвыканкам, гэта значыць, яна фінансуецца з падаткаў грамадзян.

# Ці будзе размарозка-2013?

**Актыўныя дзеянні Літвы ў перыяд старшынства ў Савеце ЕС могуць прывесці ды некаторых пазітыўных зменаў у наладжванні дыялогу паміж Беларуссю і Еўропай, але не варта разлічваць на тое, што ў бліжэйшыя паўгода ўдасца цалкам разблакаваць гэтыя адносіны,кажа намеснік старшыні Руху «За Свабоду», палітолаг Алесь Лагвінец.**

Ён схіляецца да думкі, што маючы адбыцца ў лістападзе ў Вільні саміт Усходняга партнёрства наўрад ці дадасць аптымізму што да будучыні ў стасунках Мінска і Бруселя.



*«Хочуць гэтага беларускія ўлады ці не, але ў Беларусі паступова нарастае ўсведамленне агульнай з Літвой гісторыі*

## Спроба нумар ...

Лагвінец мяркуе, што ў бліжэйшыя паўгода – перыяд старшынства Літвы ў Савеце ЕС – *«радыкальнага павароту Беларусі да Эўразвязу наўрад ці варта чакаць».*

*«Тым не менш, Літва будзе дэманстраваць беларусам, што ЕС увесь час працягвае руку і чакае, калі Беларусь і беларусы на гэтыя прапановы супрацоўніцтва адкажуць»,* – адзначыў ён у інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс-Захад».

Пэўныя зрухі ў дыялогу, працягвае намеснік старшыні «За Свабоду», могуць з'явіцца, тым больш што *«Літва – краіна, якая знаходзіцца ў найбольш зручнай пазіцыі для таго, каб спрыяць гэтаму».* У Літве, мяркуе Алесь Лагвінец, *«дастаткова прагматычна ацэньваюць сітуацыю ў Беларусі, бачаць, што яна адразу павярнуць у бок Еўрапейскага саюза не можа». «Неабходна паступальна, паказваючы прыклад, магчымасці пазітыўнай сумеснай працы, уцягваць Беларусь у агульнаеўрапейскія працэсы па частках або сегментах»,* – лічыць Лагвінец. *«Сегменты, якія датычацца бізнесу або дзяржапарату, вельмі цяжка абыйсці, а без гэтага змены ў Беларусі немагчымыя»,* – падкрэсліў ён.

Таксама *«Літва рэалістычна ацэньвае сітуацыю ў Беларусі з таго пункту гледжання, што ў краіне няма вялікай мабілізацыі людзей, якія могуць запатрабаваць палітычных зменаў».*

Між тым прасоўванню Літвой еўрапейскіх каштоўнасцяў для Беларусі можа спрыяць агульная гістарычная памяць і інтэнсіфікацыя кантактаў на ўсіх узроўнях. *«Хочуць гэтага беларускія ўлады ці не, але ў Беларусі паступова нарастае ўсведамленне агульнай з Літвой гісторыі. Апытанні грамадскай думкі паказваюць, што вялікая частка беларусаў суадносіць гісторыю Беларусі з гісторыяй ВКЛ»,* – сказаў Лагвінец. *«Інтэнсіўнасць кантактаў нарастае, што ў той ці іншай ступені таксама можа спрыяць пераменаў»,* – дадаў ён.

## Эканамічныя інтарэсы або еўрапейскія каштоўнасці?

На працягу апошніх гадоў беларускія ўлады неаднаразова нагадвалі Літве аб неабходнасці ўлічваць эканамічныя фактары пры выпрацоўцы агульнай з ЕС лініі ў дачыненні да Беларусі.

Размова сёння ўжо можа весціся не толькі аб перавалцы беларускіх грузаў праз клайпедскі порт, літоўскі капітал дынамічна пранікае ў беларускую эканоміку. У Літве бачаць у гэтым магчымасць паказаць беларусам новыя тэхналогіі, перспектывы эканамічнага росту, якія садзейнічаюць павышэнню дабрабыту. Прыкладна пра гэта казаў нядаўна літоўскі амбасадар **Эвалдас Ігнатавічус**, наведваючы з прэзідэнтам Беларусі прадпрыемства ў Магілёве, створанае з удзелам літоўскага капіталу.

Але ці не апынецца, што ў выніку нацыянальныя эканамічныя інтарэсы Літвы пачнуць пераважаць над агульнаеўрапейскімі падыходамі ў вырашэнні беларускага пытання?

*«Мне здаецца, беларускія ўлады цяпер моцна працуюць над тым, каб аддзяліць брусельскі падыход ад падыходаў краін-членаў ЕС у дачыненні да беларускай праблематыкі. Гэтыя спробы рабіліся і раней, напрыклад, у дачыненні да Латвіі, Італіі і той самай Літвы»,* – адзначыў намеснік кіраўніка Руху «За Свабоду».

Сыходзячы з наяўнага вопыту, разважае Алесь Лагвінец, *«у некаторы момант беларускія ўлады могуць выкарыстоўваць элементы шантажу ў дачыненні да тых краін, якія патэнцыйна гэтаму могуць быць схільныя, Літва можа быць у гэтым шэрагу».* Тым не менш, перакананы ён, *«было б няправільным гаварыць пра тое, што Літвой можна будзе лёгка маніпуляваць».*

*«У Літвы ёсць свой погляд на тыя ці іншыя рэчы, нацыянальныя інтарэсы, але яна стараецца дакладна прытрымлівацца еўрапейскіх каштоўнасцяў і працаваць па еўрапейскіх прынцыпам».*

Працяг на с. 7

# Беларусы супраць расійскай авіябазы


CRIMSO.MSK.RU

**Большасць апытаных НІСЭПД выказалі станоўчае стаўленне да таго, што ў апошні час у Беларусь усё часцей прыязджаюць госці з Расіі.**

31.2% – таму што *«яны блізкі нам народ»*, амаль столькі ж – таму, што *«чым больш турыстаў, тым багацейшая краіна»*, 29.5% паставіліся да гэтага абыякава, а 8.4% – *«адмоўна, мне не падабаецца, як яны сябе паводзяць»* і 7.8% – *«адмоўна, яны скупляюць нашы тавары і наша жыллё»*.

*«Аднак такое стаўленне не азначае, што большасць беларусаў падтрымліваюць і паглыбленне ваеннай інтэграцыі: менш за 20% станоўча паставіліся да нядаўняй заявы міністра абароны Расіі С. Шайгу аб магчымасці размяшчэння ў Беларусі расійскай авіябазы, 35.6% – абыякава, а 36% – адмоўна»*, – адзначаюць сацыёлагі.

Нагадаем, расейская авіябаза размесціцца ў Лідзе.

Старшыня Руху «За Свабоду» **Аляксандр Мілінкевіч** перакананы ў неабходнасці захавання за Беларуссю статусу нейтральнай дзяржавы, як гэта запісана ў Канстытуцыі. *«І нам ваенныя блокі, асабліва сёння, абсалютна не патрэбныя. Але гэта расплата за тое, што мы маем падарункі ў выглядзе танных нафты і газу, не бывае бясплатных падарункаў у такіх адносінах»*.

Што тычыцца геапалітычных прыярытэтаў, то ў грамадскай думцы захоўваецца баланс – прыкладная роўнасць паміж прыхільнікамі выбару на карысць Расіі ці Еўропы. Калі б давялося выбіраць паміж аб'яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрасаюз, што б вы выбралі, спыталіся ў беларусаў у чэрвені. 40.8% – за Расію, 41% – за ЕС.

# Ці будзе размарозка-2013 (працяг)

**Пачатак на с.6**

*Не думаю, што літоўцы так проста ў знешняй палітыцы адмовяцца ад сваіх прынцыпаў, улічваючы пастаянную канкурэнцыю з іншымі краінамі ЕС . Больш за тое, калі Літва будзе далёка заходзіць, то калегі па ЕС змагу пэўным чынам адкарэктаваць гэтую пазіцыю»*, – сказаў Лагвінец.

## Еўропа сігналізуе, Мінск маўчыць

Суразмоўца перакананы, што толькі пры наяўнасці палітычнай волі з абодвух бакоў можна разблакаваць беларуска-еўрапейскія адносіны.

*«Зразумела, што з боку афіцыйнага Мінска палітычная воля шмат у чым абумоўліваецца станам адносін з Расіяй»*, – адзначыў Лагвінец.

Паводле яго слоў, ЕС ужо зрабіў крокі насустрач, у тым ліку, зняў візавыя абмежаванні ў дачыненні да кіраўніка беларускага МЗС. *«Падрыхтаваны праект рэзалюцыі Еўрапарламента, які будзе разглядацца ўвосень, таксама з'яўляецца пазітыўным сігналам. Акрамя таго, наколькі вядома, у хуткім часе Мінск наведае дэлегацыя Еўрапарламента. Ці будзе развіццё падзей – пытанне застаецца адкрытым»*, – кажа эксперт-рухавец.

Між тым, лічыць Алесь Лагвінец, *«у сённяшняй сітуацыі, калі ўнутраная дынаміка не такая ўжо актыўная, не варта чакаць кардынальных змен у адносінах Беларусі і ЕС»*.

Як паведамлялася з Брусеня, Еўрасаюз спадзяецца размарозіць адносіны з Беларуссю на саміце Усходняга партнёрства. У прыватнасці, у рэкамендацыях камітэта па замежных справах Еўрапарламента, якія прынятыя па выніках разгляду справаздачы літоўскага дэпутата Юстаса Палецкіса, Еўрасаюз павінен скарыстацца старшынствам ў ім Літвы і маючым адбыцца самітам Усходняга партнёрства ў Вільні, каб разблакаваць адносіны з Беларуссю.

Тым не менш, *«безумоўнае і неадкладнае»* вызваленне ўсіх беларускіх палітвязняў застаецца *«неабходнай умовай»* для адмены санкцый ЕС і галоўнай умовай для нармалізацыі адносін паміж ЕС і Мінскам.




NAVINY.BY

# За «спартыўную» Беларусь!

Беларусь апынулася наперадзе ў рэйтынгу «амаральных» краін, які быў складзены агенцтвам Bloomberg на падставе шэрагу паказчыкаў: колькі літраў алкаголю выпівае дарослы жыхар краіны ў год, колькі цыгарэт выкурвае, доля ВУП, якая траціцца народам на азартныя гульні, і працэнт насельніцтва, якое ўжывае наркотыкі.

Дзясятка дзяржаў заганы: Чэхія, Славенія, Аўстралія, Арменія, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Расія, Беларусь і Грэцыя. Усяго ў рэйтынг трапілі 57 краін.

Беларус, напрыклад, выпівае па 18,86 літра алкаголю на год (сусветнае лідарства), выкурвае 2266 цыгарэт, 0,25% ВУП ідзе на азартныя гульні, 2,28% беларусаў сядзіць на наркотыках.

# Логіка коштаў :)




NAVINY.BY

## Анекдоты:

Беларусь. Ідзе мужык па вуліцы. Раптам спыняецца і кажа: «Вось свалота!»

Да яго адразу падскокваюць два міліцыянты і цягнуць у аддзяленне.

Там яму кажуць:

– Вы абвінавачваецца ў паклёпе на прэзідэнта.

– А я не паклёпнічаў.

– Ну вы ж казалі – «сволач».

– Так, але гэта я пра суседа.

– А вось гэтага не трэба. Усе ведаюць, хто ў нас сволач…

***

Жылі-былі мышы, і ўсе іх крыўдзілі. Неяк пайшлі яны да мудрага пугача і кажуць:

– Мудры пугач, дай параду. Усё нас крыўдзяць, каты і не толькі. Што нам рабіць?

Пугач падумаў і кажа:

– А вы станьце вожыкамі! У вожыкаў іголкі – іх ніхто не крыўдзіць.

Мышы ўзрадаваліся і пабеглі дахаты. Але па дарозе адна мыш сказала:

– Як жа мы станем вожыкамі?

І ўсё пабеглі зноў да пугача:

– А як жа мы станем вожыкамі?

Той:

– Вы мяне глупствам не грузіце. Я стратэгіяй займаюся.

***

Калі прайграюць беларусы, у расійскіх навінах пішуць: «Параза беларусаў».

Калі ж яны выйграюць, у расійскіх навінах пішуць: «Перамога савецкай школы».

***

Які ў Беларусі ўзровень жыцця?

– Мы ўжо прайшлі ўсе ўзроўні і пачалі гульню спачатку.

***

Жыхара Мінска пытаюцца:

– Чаму вы ўвесь час п’яны?

– А што рабіць, калі па ўсім Мінску вісяць плакаты «За Беларусь!».

***

– Аляксандр Рыгоравіч, ці вы калі-небудзь памыляліся?

– Так, аднойчы мне здалося, што я памыліўся. Але я памыліўся.

Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 26.07.2013 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, е-пошта: info@рух.by